*Першы курс — гэта, напэўна, самы цікавы і адказны перыяд навучання ва ўніверсітэце. З аднаго боку, самастойнае жыццё, нечаканыя знаёмствы, новыя сябры, цёплыя сустрэчы. З другога — як ты зарэкамендуеш сябе на самым пачатку, так і складзецца твая далейшая вучоба.*

*Якім ён быў, першы курс, для выпускнікоў нашай альма-матар? Сёння яны дзеляцца з намі сваімі ўспамінамі.*

**Анастасія САЛАЎЁВА, выпускніца гістарычнага факультэта 2005 года:**



— Першы свой курс нязменна ўзгадваю з пяшчотай. Гэта хіба ці не самы рамантычны перыяд. У цябе ўсё наперадзе, усе дзверы перад табою адчынены, усе вышыні, здаецца, могуць лёгка скарыцца перад табою. Нарэшце адчуваеш сябе дарослым, самастойным, адказным за сваё жыццё. Новыя знаёмствы, доўгія пасядзелкі ў бібліятэцы (мы, здавалася, больш гаварылі там адзін з адным, чым вучыліся), першая сесія, курсавая работа, напісаная ад рукі (колькі старонак я перапісвала з-за памылак – гэтага ў памяці, дзякаваць богу, не захавалася), ну і, вядома, вечарынкі з аднакурснікамі.

Усё гэта склалася ў выдатную і вельмі цёплую карціну першага года навучання. Але, мусіць, самыя яркія ўспаміны пакінула археалагічная практыка. Тры тыдні мы жылі ў намётах на беразе Дзвіны, гатавалі сабе ежу на вогнішчы, вялі раскопкі. Мо таму мой сын цяпер хоча стаць археолагам?..

# ПЕРШЫ КУРС НЯЗМЕННА ЎЗГАДВАЕЦЦА З ПЯШЧОТАЙ

**Вікторыя ДАШКЕВІЧ, выпускніца факультэта беларускай філалогіі, гісторыі і культуры 1996 года:**




— Я стала першакурсніцай у 1991 годзе. Гэта быў злом эпох. І дух часу — самае галоўнае, што прыгадваецца цяпер.

Беларускі філфак толькі стаў самастойным і адразу ж ператварыўся ці не ў самы запатрабаваны факультэт тады яшчэ педагагічнага інстытута. Веданне мовы давала неблагія бонусы, адпаведна, конкурс быў вялікім. А чым большы конкурс, тым лепшых можна выбраць студэнтаў. І мне здавалася, што вакол самыя таленавітыя, самыя разумныя людзі. Зорным быў і выкладчыцкі склад.

Мне спатрэбілася, напэўна, пара год, каб зразумець: не ўсе аднакурснікі могуць быць маімі сябрамі, не на ўсіх лекцыях мне аднолькава цікава. Але на першым курсе адчуванне акрыленасці было шалёным. Мне шаснаццаць, і ўсе шляхі мае — выбірай любы. У той год адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча. На хвалях беларусізацыі — шырока і гучна. Не памятаю, хто быў тады аўтарам гэтай ідэі, але кожнай групе факультэта прапанавалі зрабіць прысвечаны паэту літмантаж, кампазіцыю або міні-спектакль — хто як адчуе. Мы ў той час былі не такімі смелымі і разняволенымі, як сённяшняя моладзь. Тым не менш, не адмовіўся ніхто.

Неяк, перабіраючы старыя паперы, я знайшла сцэнарый таго выступлення. Мая група тады пісала п'есу. Як здавалася нам, сур'ёзную і сімвалічную. На цяперашні мой погляд — паўдзіцячую і смешную.

«Удзельнікі выходзяць на сцэну са свечкамі, укленчваюць, чытаюць рэмарку.

Гучыць верш:

*На добры помнік*
*ты не зарабіў,*
*Як на прысутнасць бацькі ў час апошні.*
*Цябе мы грамадою прадалі:*
*Малюем,*
*славім —*
*толькі ўсё — за грошы...»*

Верш рамантычнай Людмілы Рублеўскай, здавалася, трэба чытаць гэтак жа ўзнёсла, на каленях, з душой нараспашку, абавязкова пры свечках.

Так, мы былі наіўнымі, але прынцыповымі і бескампраміснымі. Лаўлю сябе на тым, што дагэтуль ведаю гэты верш на памяць.

Можа быць, цяпер нам, абцясаным часам і жыццём, лягчэй жыць. Мы ўжо не смешныя, мы больш гнуткія, мы хаваем свае прынцыпы і ўмеем прыстасоўвацца і выжываць. Але часам здаецца, што самымі сапраўднымі і шчырымі перад сабой мы былі менавіта тады.

Жадаю, каб сённяшнія першакурснікі таксама запомнілі свой першы курс як самы лепшы перыяд у жыцці.